# ВЫКАРЫСТАННЕ НЕТРАДЫЦЫЙНЫХ ТАБЛІЦ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ Ў ШКОЛЕ ТЭМЫ «ПРОСТЫ ЎСКЛАДНЕНЫ СКАЗ»

**Ю. А. Буднікава, В. С. Мягчыла**

Распрацаваны намі комплекс матэрыялаў па пунктуацыі беларускай мовы складаецца з табліц і тэстаў з ключамі да іх і прызначаны для агульнаадукацыйнай сярэдняй школы. Прапанаваныя табліцы змяшчаюць правілы па тэме «Ускладнены просты сказ».

Адметнасцю нашых табліц і тэстаў з’яўляецца тое, што яны складзены згодна з сучаснымі ведамі ў галіне псіхалогіі [1, с. 3–9]. Пры сістэматызацыі ведаў па пунктуацыі ўлічваліся асаблівасці розных спосабаў успрыняцця. Пунктуацыя лягчэй за ўсё даецца аўдыалам, бо ў вусным маўленні знакі прыпынку чалавек часцей за ўсё пазначае інтанацыяй. А візуалы і кінестэтыкі не могуць улавіць інтанацыйных нюансаў. Пры дапамозе гэтых табліц мы паспрабавалі адаптаваць правілы для іх сістэмы ўспрыняцця.

Па-першае, сама форма табліц, у адрозненне ад суцэльнага тэксту, садзейнічае больш лёгкаму вылучэнню неабходных звестак, іх сістэматызацыі.

Па-другое, засваенню матэрыялаў садзейнічае зрокавае ўспрыняцце (выдзяленне колерам арфаграм у тэстах, пунктаграм у табліцах, тлустым шрыфтам – ключавых слоў, курсівам – прыкладаў).

Па-трэцяе, прыклады, прыведзеныя ў табліцах, уплываюць на запамінанне правіла. Пэўныя вобразы, асацыятыўныя рады дапамагаюць хуткаму засваенню інфармацыі. У якасці такіх вобразаў мы выкарыстоўваем забаўляльныя персанажы, незвычайныя сітуацыі. Кожнае правіла прадстаўляюць пэўныя героі, такім чынам аблягчаецца запамінанне асобных выпадкаў, бо яны застаюцца ў памяці не асобнымі часткамі, а цэлым блокам. Забаўляльны характар садзейнічае запамінанню правілаў, бо выклікае пэўную эмацыянальную рэакцыю.

Дадзеныя табліцы і тэсты можна выкарыстоўваць на ўроках па мове пры вывучэнні пэўнай тэмы, забяспечыўшы кожнага вучня матэрыялам. Больш карыснай будзе індывідуальная праца ці заняткі ў малых групах. Хуткаму запамінанню садзейнічае і магчымасць вучняў самастойна прыдумваць цікавыя прыклады, што актывізуе творчае развіццё вучняў.

Важнае значэнне мае схема працы, бо ў працэсе вывучэння можна рухацца не ад правілаў да тэксту, а наадварот, ад тэксту да правілаў. Такім чынам, вучань у табліцах з правіламі знаходзіць пацверджанне сваім меркаванням.

Прыводзім у якасці прыкладу апісаныя вышэй тэст і табліцы (табл. 1,

табл. 2).

*Табліца 1*

**Адасобленыя акалічнасці (дзеепрыслоўныя звароты), або пра другую маладосць Бабы-Ягі**

| Адасабляюцца | Не адасабляюцца |
|---|---|
| Акалічнасці, выражаныя **дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі**, незалежна ад месца ў сказе і ад таго, развітыя яны ці адзіночныя: ***Шчасце ў каханні знаўшоўшы,*** *Баба-Яга памаладзела душою і адчувала сябе на ўсе васемнаццаць год.* | Адзіночныя дзеепрыслоўі, якія па сваёй ролі **набліжаюцца да прыслоўяў спосабу дзеяння**: *Песні Салаўя-Нягодніка ліліся пад вокнамі Бабы-Ягі* ***не сціхаючы****.* |
| Акалічнасці са **значэннем уступкі**, калі яна выражана назоўнікам з прыназоўнікам (нягледзячы на): ***Нягледзячы на свае немаладыя гады,*** *Баба-Яга цяпер кожную раніцу прыхарошвалася каля люстэрка.* | Развітыя акалічнасці, якія па сэнсе **цесна звязаны з выказнікам**: *Баба-Яга сядзела* ***схіліўшыся над сталом*** *і чытала вершы аб каханні, якія прыслаў ёй Салавей-Нягоднік.* |
| | **Фразеалагізмы**, у складзе якіх ёсць дзеепрыслоўі: *Баба-Яга вырашыла быць аптымісткай і жыць* ***не апускаючы рук****.* |
| | Адзіночнае дзеепрыслоўе, якое стаіць пасля прыслоўя і звязана з ім пры дапамозе злучніка **і**: ***Імкліва і не разбіраючы дарогі,*** *спяшаўся Салавей-Нягоднік на сустрэчу да Бабы-Ягі.* |

## ТЭСТ 1

1. Уважліва прачытайце і перапішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.

Адкуль пайшлі паны на Палессі

Даўно гэта было. Нават старыя людзі падумаўшы таго не ўспом-няць. І расказваюць яны тое, што чулі ад бацькоў і дзядоў.

Ну дык вось. Густымі цёмнымі лясамі Палессся прабіраўся адвячоркам чорт у сваё балота. **Не** нашкодзіўшы за цэлы дзень ні разу людзям ён засмуціўся. Які ж я пасля гэтага чорт?

І раптам бачыць – едзе павольна і **не** спяшаючыся пан з Варшавы. Спераду гайдукі едуць ззаду таксама, а пан – пасярэдзіне на мяккіх падушках седзячы. Вусы ў бакі тарчаць як у жука караеда шапка з трыма рагамі чобаты чырвоныя. Адным словам на сто сажняў панам пахне!

**Пера**гарадзіў чорт дарогу вылупіў вочы дзівіцца – ніколі на Па-ле**сс**і такога пудзіла **не** бачыў.

– Прэч **з** дарогі пся крэў! – закрычаў пан грозна варушачы вусамі.

Чорт стаіць **не** варухаючыся. Заляскалі гайдукі бізунамі і кінуліся да чорта. А той пераскочыўшы цераз іх ухапіў пана за чу**б** і панёс над лесам выскаляючыся.

Ляціць чорт і лупіць панам аб верхавіны дрэў. Дзе аб ду**б** рэзнуўся панам – там адразу вырастае новы пан Дэмбіцкі, а за ім – Дубіцкі... Аб бярозу грымнуўся – з’явіўся пан Бжэзінскі, а за ім – Бжэзоўскі, а за Бжэзоўскім – Беразоўскі... Як грыбы растуць паны.

Гойсаў гойсаў чорт з панам ды змарыўшыся прысеў **ад**пачыць. Сам аж **с**пужаўся чорт паглядзеўшы на пана: адны вантробы заста-ліся. «Што з імі рабіць?» – думае чорт – «Не несці ж іх у пекла?»

Узяў ён лішкі пана і паляцеў растрасаючы іх па зямлі. І ад іх пайшлі расці дробныя паны і **паў**панкі.

Так развяліся паны на Пале**сс**і – сам чорт пасеяў іх на пакуту доб-рым людзям.

2. Колькі дзеепрыслоўных зваротаў і адзіночных дзеепрыслоўяў у тэксце:

А. 6; Б. 8; В. 10; Г. 12; Д. 4; Е. 9.

3. Укажыце, на месцы якіх лічбаў павінны стаяць коскі.

Акторы ўсе на сцэне (1)
Хадзілі (2)
Бы**цц**ам цені.
І на балконе (3) гледачы (4)
Дрыжалі (5)
Моўчкі гледзячы (6)
Як важна (7)
У партэры
Сядзелі
**Дз**ве пантэры.
(Р. Барадулін. На прэм’еры)

4. Укажыце, якое са сцверджанняў правільнае:

*– Прэч **з** дарогі пся крэў! – закрычаў пан грозна варушачы вусамі.*

А. Выкарыстаная старая форма *пся крэў* (сучасная – сабачая кроў).

Б. Выкарыстанае запазычанне з польскай мовы *пся крэў* (у перак-ладзе – сабачая кроў).

*Табліца 2*

**Пабочныя сказы і словазлучэнні,**
**ці колькі слоў пра жыццё Пятачка і Віні Пуха**

| Дужкамі аддзяляюцца | Працяжнік ставіцца |
|---|---|

| | |
|---|---|
| Пабочныя сказы, што **пасняюць асобныя словы:**<br>*Віні Пух папрасіў **<u>Пятачка (гэта быў яго найлепшы сябра)</u>** купіць у пчолаў меду.* | Перад другім працяжнікам ставіцца коска, калі гэтага патрабуе структура другой часткі:<br>*Пятачок падумаў **<u>– і ен меў рацыю, –</u>** што з пчоламі лепш не сварыцца.* |
| Пабочныя сказы, што **дапаўняюць ці ўдакладняюць** змест асноўнага сказа:<br>*Пятачок падараваў Іа зялёны **<u>шарык (гэта быў яго ўлюбёны колер)</u>**, а Віні Пух – пусты гаршчок ад мёду.* | Перад першым працяжнікам ставіцца коска, калі гэтага патрабуе структура першай часткі:<br>*На дзвярах Зайцавага дома, куды Пятачок так спяшаўся**<u>, – які жах! –</u>** вісеў замок.* |
| Пабочныя канструкцыі, якія маюць **далучальны характар**, хаця і звязаныя сінтаксічна з асноўным сказам:<br>*Віні Пух з усіх сваіх знаёмцаў асабліва шанаваў пчол **<u>(ён нават казаў, што ў дзяцінстве марыў нарадзіцца пчалой)</u>**.* | І перад першым, і перад другім працяжнікамі ставіцца коска, калі гэтага патрабуюць структуры абедзвюх частак:<br>*Пятачок вырашыў наведаць старога мудрага Філіна, які апошнім часам займаўся чытаннем філасофскіх трактатаў**<u>, – у асноўным гэта былі працы самаго Філіна, –</u>** запытацца пра здароўе і заадно пазычыць грошай.* |

Табліцы «Пабочныя словы», «Пабочныя сказы і словазлучэнні» былі падрыхтаваны Ж. В. Капустай, «Адасабленне прыдаткаў», «Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа», «Пра аднародныя члены сказа з абагульняльным словам» – Ю. А. Буднікавай, «Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам» – В. У. Гатоўскай, «Адасаб-ленне сінтаксічных канструкцый са злучнікамі як, быццам, чым і г. д.» – Я. А. Лапшыной, «Адасабленне акалічнасцяў і дапаўненняў, якія выражаныя прыназоўнікавымі спалучэннямі», «Адасобленыя акалічнасці (дзеепрыслоўныя звароты)» – В. С. Мягчылай, «Адасаб-ленне дапасаваных азначэнняў», «Адасаблення недапасаваных азначэнняў» – Н. У. Каралёвай, «Аднародныя і неаднародныя азначэнні» – С. В. Бабарыкай, «Выклічнікі, часціцы» «Знакі прыпынку ў сказах са словамі, якія паўтараюцца» – А. Я. Мальцавай, «Удакладняльныя члены сказа» – Т. У. Булаўкай.

**Літаратура**


1. *Соколова Л. Л., Соколова М. В.* Пунктуация. Лексика. Культура речи. (Таблицы и тесты). СПб., 2003.